# СВАРКА ПА-ЦЭЙЛОНСКУ



## ШТО АДБЫВАЕЦЦА НА ШРЫ-ЛАНЦЫ?

**Сёлета сакавік на Шры-Ланцы выдаўся надзвычай неспакойным. На тэрыторыі астраўной дзяржавы нават прыйшлося ўводзіць рэжым надзвычайнага становішча. На такія меры пайшоў прэзідэнт краіны Майтрыпала Сірысена. Паводле паведамлення мясцовага тэлеканала News First, гэта адбылося пасля таго, як у адным з раёнаў краіны пачаліся антымусульманскія пратэсты. Як раней паведамлялі СМІ, асобныя ўспышкі гвалту паміж будыстамі і мусульманамі першапачаткова былі зафіксаваныя ў горадзе Дыгана, аднак затым распаўсюдзіліся і на іншыя часткі Шры-Ланкі. У сувязі з гэтым у некаторых раёнах была ўведзена каменданцкая гадзіна, у мэтах аховы правапарадку разгорнуты дадатковыя падраздзяленні паліцыі і арміі. Сітуацыю ўдалося стабілізаваць, і рэжым надзвычайнага становішча адмянілі праз 10 дзён пасля ўвядзення. «Вярнуўся з вельмі ўдалай паездкі ў Японію, якая прынясе нам шмат карысці ў кароткатэрміновай і доўгатэрміновай перспектыве. Ацаніўшы сітуацыю з грамадскай бяспекай, я даручыў адмяніць надзвычайнае становішча», — напісаў Майтрыпала Сірысена ў сваім афіцыйным «Твітэры». З-за чаго ліхаманіла Шры-Ланку і якія перспектывы ўзнікнення такой сітуацыі надалей?**

### Чай і сапфіры

Востраў Шры-Ланка размешчаны ў Паўднёвай Азіі, крыху на ўсход ад паўднёвага ўскрайку Індастана, і абмываецца водамі Індыйскага акіяна і Бенгальскага заліва. Аддзелены ад Індастана Манарскім залівам і Полкскім пралівам. Так званы Адамаў Мост — водмель у Полкскім праліве — калісьці цалкам злучаў Шры-Ланку з мацерыком, але, па даных летапісаў, быў разбураны землятрусам каля 1481 года.

Сёлета Дэмакратычная Сацыялістычная Рэспубліка Шры-Ланка ўрачыста святкавала адметную дату — 70-годдзе незалежнасці. Менавіта 4 лютага 1948-га краіна атрымала незалежнасць, яна называлася Дамініён Цэйлон (фармальна застаючыся дамініёнам Вялікабрытаніі). Сваю цяперашнюю назву дзяржава атрымала толькі ў 1972 годзе. Шры-Ланка ў перакладзе з санскрыту азначае «добраслаўлёная зямля». Афіцыйная сталіца — Шры-Джаявардэнепура-Котэ (месца «прапіскі» парламента і вярхоўнага суда), фактычная — Каломба (тут размяшчаецца будынак урада, а таксама рэзідэнцыя прэзідэнта).

На востраве вырабляецца каля 10 працэнтаў усяго чаю ў свеце — звыш 300 тысяч тон у год. Не дзіўна, што гэты прадукт па праве з'яўляецца візітнай карткай Шры-Ланкі. На дадзены момант дзяржава займае трэцяе месца ў свеце па аб'ёмах вытворчасці чаю, саступаючы толькі Індыі і Кітаю. Яшчэ на Шры-Ланцы ў прамысловых маштабах здабываюць сапфіры.

Усё большую ролю ў эканоміцы краіны адыгрывае турызм. Папулярнасцю карыстаюцца прыморскія курортныя гарады (Маратува, Гале), гістарычныя славутасці (Кандзі, Анурадхапура, Паланарува, Сігірыя), горны курорт Нувара-Элія. Турысты наведваюць таксама чайныя плантацыі, нацыянальныя паркі і рэлігійна-гістарычныя помнікі будызму, напрыклад храм зуба Буды ў Кандзі (старажытнай сталіцы вострава), дзе захоўваецца адна з самых шанаваных у свеце будысцкіх святынь (уласна, зуб Буды). У пачатку XIX стагоддзя на Шры-Ланцы налічвалася больш за 30 тысяч сланоў. Праўда, з цягам часу папуляцыя значна паменшала — у 2010-м тут засталося толькі каля 6 тысяч гэтых жывёл.

Шры-Ланка імкліва развіваецца — рост валавога ўнутранага прадукту складае ў сярэднім каля 5 працэнтаў у год. Адметна, што гэтая астраўная краіна апошнім часам у лідарах сярод дзяржаў Паўднёвай Азіі па аб'ёме ВУП у разліку на душу насельніцтва.

### Час «тыграў»

Сёлета ўнутраная сітуацыя ў краіне абвастрылася. У канцы лютага на Шры-Ланцы падарвалі аўтобус з ваеннымі, пацярпелі 19 чалавек, паведаміла агенцтва Reuters. Выданне адзначала, што пасля заканчэння ў 2009 годзе працяглай грамадзянскай вайны на Шры-Ланцы мэтанакіраваных нападаў на ваенных яшчэ не здаралася. Як вядома, узброены канфлікт паміж цэнтральным урадам і ваенізаваным рухам «Тыгры вызвалення Тамїл Ілама» (дамагаліся стварэння незалежнай тамільскай дзяржавы на тэрыторыі краіны) працягваўся з 1983-га па 2009 год і забраў жыцці па меншай меры 100 тысяч чалавек.



Дарэчы, гісторыя гэтага супрацьстаяння налічвае больш за паўсотню гадоў. Асноўны матыў — этнічны. Тамільская меншасць у сярэдзіне мінулага стагоддзя стала настойваць на сваёй незалежнасці. Аднак сінгальскі ўрад не задаволіў іх патрабаванні. Тады рупарам барацьбы за незалежнасць стала сепаратысцкая групоўка «Тыгры вызвалення Тамїл-Ілама» (ТВТІ). Менавіта іх дзеянні ў ліпені 1983-га паслужылі пачаткам грамадзянскай вайны. Тады баевікі атакавалі ўрадавы патруль у горадзе Джафна, што выклікала рэакцыю ў адказ сінгалаў, якія арганізавалі тамільскія пагромы.

«Тыгры» кантралявалі амаль усе тэрыторыі паўночнага і ўсходняга ўзбярэжжа Шры-Ланкі. Фактычна ўся гэтая частка краіны жыла адасоблена, не падпарадкоўваючыся законам дзяржавы. У баевікоў былі свае КПП на неафіцыйнай дэмаркацыйнай лініі з тэрыторыяй афіцыйнай улады, якія існавалі амаль легальна. Урадавыя войскі не заўсёды вялі актыўныя баявыя дзеянні супраць паўстанцаў. У 2002-м пры пасярэдніцтве Індыі ўдалося дасягнуць перамір'я. Аднак доўжылася яно ўсяго крыху больш за тры гады.

У шэрагах ТВТІ ваявалі і жанчыны — па розных падліках, яны складалі ад 20 да 30 працэнтаў усіх вайскоўцаў. Асабліва актыўна іх прыцягвалі да аперацый так званых чорных тыграў (падраздзяленне тэрарыстаў-смяротнікаў, якія здзяйснялі напады на палітычныя, эканамічныя і ваенныя цэлі), паколькі спецслужбам складаней распазнаць тэрарыста-смяротніка ў жанчыне. Баевікі таксама вербавалі і навучалі вядзенню вайны дзяцей, яны ўпершыню ўжылі «паясы смяротнікаў».

Пасля мноства няўдач і некалькіх перамір'яў урадавыя сілы здолелі атрымаць перамогу над «тыграмі». 18 мая 2009 года 50-тысячная групоўка ўрадавых войскаў Шры-Ланкі скончыла апошнюю аперацыю ў грамадзянскай вайне. На поўначы краіны, на паўвостраве Джафна, пасля ўзяцця Мулайтыву былі акружаны і ліквідаваны асноўныя сілы тамільскіх сепаратыстаў. У ходзе аперацыі быў забіты нязменны лідар «тыграў» Велупілаі Прабхакаран.




### Будысцкая сіла

Апошнім часам на востраве актывізавалася будысцкая тэрарыстычная арганізацыя — «Боду Балю Сена» («будысцкія сіла»), ці проста ББС. Яна была створана манахамі Кірама Вімаладжоці і Галагодай Атэ Гнанасарай параўнальна нядаўна — у 2012-м. Адной з асноўных мэт была заяўлена абарона правоў будыстаў-гастарбайтараў, якія працуюць на Блізкім Усходзе і сутыкаюцца з забаронай здзяйсняць набажэнствы. Аднак хутка актывісты ББС разышліся: патрабавалі прэферэнцый пры паступленні ў ВНУ моладзі, якая наведвае будысцкія курсы, замены школьных настаўнікаў манахамі і спынення археалагічных раскопак у святых месцах.

Першай гучнай акцыяй ББС стаў напад на дом хрысціянскага пастара Дзінеша ў 2012 годзе: яны сцвярджалі, што ён употай займаецца празелітызмам, пераварочваючы будыстаў у хрысціянства. Праз тры месяцы натоўп на чале з манахамі штурмам узяў адзін з юрыдычных каледжаў у Каломба, дзе, як сцвярджалася, прафесары ставяць больш высокія ацэнкі абітурыентам-мусульманам, а праз некалькі дзён разграміла ўстанову пад назвай «Буда-бар» — за блюзнерства.

Адзін са стваральнікаў ББС, Галагода Атэ Гнанасара, заявіў: «Гэтая краіна створана будыстамі-сінгаламі, і яна павінна застацца краінай будыстаў-сінгалаў». Гнанасара і яго прыхільнікі заклікалі сваіх паслядоўнікаў аб'ядноўвацца супраць хрысціянскага і мусульманскага экстрэмізму. Барацьба супраць «так званай дэмакратыі» пры гэтым не перашкодзіла Гнанасары і яго давераным асобам у красавіку 2013-га наведаць ЗША з візітам дружбы — такім чынам будысцкія радыкалы спрабавалі палепшыць свой імідж у вачах амерыканскіх палітыкаў.

Любыя спробы ўрада хоць бы намякнуць на абмежаванне дзейнасці Гнанасары і яго прыхільнікаў неадкладна выклікалі актыўныя пратэсты ББС, колькасць якой пастаянна расла. І чыноўнікі раз за разам адступалі. Скончылася ўсё гэта масавымі пагромамі ў чэрвені 2014-га. Натоўп, які ўзначальвалі будыйскія святары, рабаваў мусульманскія крамы і падпальваў машыны. Звяртаючыся да радасных пагромшчыкаў, Гнанасара абвясціў: «На нашым баку — паліцыя, якая складаецца з сінгалаў. Не трэба забываць і пра армію, якая таксама складаецца з сінгалаў».

Гнанасара паспеў запатрабаваць ад Папы Францыска выбачэнняў за «зверствы хрысціянскіх каланізатараў у Паўднёвай Азіі» і асудзіць Далай-ламу за заклік да будыстаў Шры-Ланкі і М'янмы спыніць гвалт у дачыненні да мусульман і хрысціян, пакуль нарэшце суд не выпісаў ордэр на арышт няўрымслівага манаха.

### Сумная рэальнасць

«Зразумела, будысцкі тэрор — гэта сумная рэальнасць, — заявіў lenta.ru генеральны сакратар Сусветнай супольнасці будыстаў Фалоп Таіары. — На жаль, у кожнай рэлігіі ёсць свае экстрэмісты, і будызм — не выключэнне. Але і ў Бірме, і на Шры-Ланцы ўсплёск радыкалізму ў першую чаргу выкліканы племяннымі адрозненнямі і складанай палітычнай сітуацыяй у гэтых краінах».

Канфлікт паміж прадстаўнікамі дзвюх канфесій узмацняўся на Шры-Ланцы на працягу мінулага года. Будысты-фундаменталісты абвінавачваюць мусульман у прымусе людзей перайсці ў іслам і разбурэнні іх рэлігійных помнікаў. Некаторыя нацыяналісты таксама выступалі супраць прыёму Шры-Ланкой бежанцаў рахінджа, якія ўцякалі ад пераследу ў М'янме.

Як змагацца з рэлігійным тэрарызмам, пакуль незразумела, заўважаюць спецыялісты. Прымяненне войска і паліцыі не заўсёды дае патрэбны вынік: у шэрагах сілавікоў, як правіла, нямала прадстаўнікоў рэлігій, супраць радыкальнага крыла якіх яны павінны змагацца, і яны нярэдка спачуваюць экстрэмістам. Дарэчы, у Шры-Ланцы былі затрыманыя больш за 230 чалавек, якія падазраюцца ў датычнасці да гвалту ў раёне Кандзі ў цэнтральнай частцы краіны ці ў распаўсюдзе ненавісніцкіх выказванняў у інтэрнэце. Паводле афіцыйных даных, у выніку ўспышкі гвалту ў сакавіку загінулі тры чалавекі, больш за 400 жылых дамоў і крам былі разбураны, некалькі мячэцяў атрымалі пашкоджанні.

**Захар БУРАК.**